**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Рэктар установы адукацыі
“Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт
імя А.С.Пушкіна”
____________ Ю.П.Голубеў
“02” __10__ 2023 г.

# ВОДЗЫЎ

апаніруючай арганізацыі ўстановы адукацыі
“Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С.Пушкіна” на дысертацыю
Дзігадзюк Валянціны Паўлаўны “Катэгорыя праспекцыі і рэтраспекцыі
ў мастацкай прозе У. Гніламёдава”, якая прадстаўлена
на атрыманне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук
па спецыяльнасці 10.02.01 – беларуская мова

**Адпаведнасць зместу дысертацыі заяўленай спецыяльнасці і галіне навукі**

Змест дысертацыі, яе асноўныя палажэнні і вынікі сведчаць пра тое, што дысертацыя адпавядае заяўленай спецыяльнасці 10.02.01 – беларуская мова і галіне навукі “Філалогія”, а таксама патрабаванням ВАК, якія прад’яўляюцца да дысертацыі на саісканне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук.

**Навуковы ўклад саіскальніка ў рашэнне навуковай задачы з ацэнкай яго значнасці**

Дысертацыя Дзігадзюк Валянціны Паўлаўны “Катэгорыя праспекцыі і рэтраспекцыі ў мастацкай прозе У. Гніламёдава” прысвечана вывучэнню катэгорый праспекцыі і рэтраспекцыі ў мастацкіх творах У. Гніламёдава. Аналіз фактычнага матэрыялу, выбранага з твораў У. Гніламёдава, праводзіцца на аснове выяўлення сістэмы моўнай рэпрэзентацыі катэгорый праспекцыі і рэтраспекцыі. Упершыню ў беларускім моваznaўстве быў выяўлены рэпрэзентатыўны корпус катэгорый праспекцыі і рэтраспекцыі ў мастацкай прозе, які ўключае рознаўзроўневыя адзінкі; вызначаны тыпы і віды праспекцыі і рэтраспекцыі ў раманах У. Гніламёдава.

На сённяшнім этапе развіцця мовазнаўства сістэмна-структурная парадыгма дапаўняецца антрапацэнтрычнай, пры якой адбываецца пераключэнне зацікаўленняў даследчыка з аб’екта пазнання на суб’ект, тым самым аналізуецца чалавек у мове і мова ў чалавеку. У межах названай парадыгмы ўзніклі новыя лінгвістычныя дысцыпліны: лінгвістыка тэксту, камунікатыўная лінгвістыка, кагнітыўная лінгвістыка, эталінгвістыка, лінгвакультуралогія, лінгвакраіназнаўства і інш.

Пры скіраванасці навуковай парадыгмы даследавання на антрапацэнтрычную моўныя катэгорыі аналізуюцца з улікам метадалагічных прынцыпаў камунікатыўнай, функцыянальнай і кагнітыўнай лінгвістыкі і прагматыкі тэксту. Катэгорыі праспекцыі і рэтраспекцыі вывучаюцца ў

расійскім мовазнаўстве такімі навукоўцамі, як Ю.В. Багаяўленскай, Ю.Ю. Барышнікавай, М.М. Болдыравым, Я.А. Чыгоўскай. Самі катэгорыі кваліфікуюцца неадназначна, што тлумачыцца супярэчлівасцю фундаментальных анталагічных тэорый у лінгвістыцы. У беларускім мовазнаўстве назіраецца фрагментарнае даследаванне катэгорый праспекцыі і рэтраспекцыі. У лінгвістычнай літаратуры адсутнічаюць даследаванні канцэптуальнага апісання катэгорый праспекцыі і рэтраспекцыі ў беларускай мове з вызначэннем тэарэтычных асноў і метадалагічных прынцыпаў даследавання. Актуальным у гэтым плане застаецца выяўленне кваліфікацыйных, класіфікацыйных і сістэмаўтваральных параметраў для аналізу і ўпарадкавання тыпа-відавога класа праспекцыі і рэтраспекцыі, сродкаў і спосабаў іх моўнай рэпрэзентацыі. Такі падыход захоўвае сваю надзённасць у вырашэнні пытанняў аналізу катэгорыі не па аналогіі з граматычнай тэмпаральнасцю, а ў адпаведнасці са спосабамі эксплікацыі іх сэнсавых, структурных і мадальных маркераў. У сувязі з гэтым відавочнымі бачацца актуальнасць праблематыкі даследавання В.П. Дзігадзюк.

Праведзены аргументаваны аналіз фактычнага матэрыялу, выбранага з раманаў У. Гніламёдава, дазволіў аўтару правесці сістэматызацыю сродкаў моўнага выражэння праспектыўнай і рэтраспектыўнай прастор з улікам наступных параметраў упарадкавання: магчымасці структурна-сэнсавай дыферэнцыяцыі праспекцыі і рэтраспекцыі і іх моўнай рэпрэзентацыі, сюжэтна-кампазіцыйных і жанравых асаблівасцей мастацкіх твораў.

Адзначым, што навуковае асэнсаванне катэгорыі праспекцыі і рэтраспекцыі дазволіла В.П. Дзігадзюк выявіць і сістэматызаваць логіка-семантычныя адносіны паміж праспектыўнымі і рэтраспектыўнымі кампанентамі, маркерамі фарміравання праспектыўнай і рэтраспектыўнай прастор і дыяпазону мадальна-сэнсавых і камунікатыўна маркіраваных значэнняў праспектыўных структур. Важным для айчыннага мовазнаўства з'яўляецца створаны аўтарам дысертацыі рэпрэзентатыўны корпус катэгорый праспекцыі і рэтраспекцыі мастацкай прозы У. Гніламёдава; скваліфікаваныя тыпы праспекцыі і рэтраспекцыі ў адпаведнасці з сюжэтна-кампазіцыйнымі асаблівасцямі раманаў У. Гніламёдава з мэтай далейшай распрацоўкі названых катэгорый у мове мастацкай прозы.

Не выклікае пярэчанняў выснова, што рэпрэзентацыя кампазіцыйна-тэкставай праспекцыі ажыццяўляецца з дапамогай адносін паміж тэкставымі кампанентамі. Дадзены рэпрэзентатыўны клас уключае праспекцыю, паміж кампанентамі якой зафіксаваны логіка-семантычныя адносіны тоеснасці, уключэння, перасячэння, неадпаведнасці. Характэрнай асаблівасцю адносін тоеснасці і ўключэння з'яўляецца канстантны характар сюжэтнай лініі.

Сістэмна ахарактарызавана даследчыцай спецыфіка кампазіцыйна-тэкставай рэтраспекцыі. Адметнасцю з'яўляецца пазасюжэтны спосаб увядзення рэтраспектыўнай інфармацыі. Аўтарам выдзелены такія прыёмы рэпрэзентацыі кампазіцыйна-тэкставай рэтраспекцыі, як супастаўленне і параўнанне, прыём прамой актуалізацыі мінулых падзей, увядзенне ў сюжэт мастацкага твора імён вядомых дзеячаў, іх цытат, гістарычных падзей і фактаў, якія імпліцытна актуалізуюць зрух у часавы план мінулага.

Дысертантка на канкрэтных прыкладах пераканаўча і доказна даводзіць, што рэпрэзентацыя рэтраспекцыі ажыццяўляецца на лексіка-граматычным узроўні і прадстаўлена наступнымі спосабамі і сродкамі: лексічным паўторам, сінаніміяй, займеннікамі, лексемамі, што змяшчаюць рэтраспектыўную інфармацыю. Рэтраспектыўныя кампаненты ў працэсе функцыянавання набываюць структуру складаназлучаных, складаназалежных, бяззлучнікавых сказаў, сказаў камбінаванай будовы, канструкцый з сінтаксічнай непаўнатой і імпліцытнай семантыкай, рэдукаваных, эліптычных, далучальных і ўстаўных канструкцый.

Аналіз твораў У. Гніламёдава дае магчымасць В.П. Дзігадзюк зрабіць выснову, што ўсе значэнні, маркеры, адносіны і прыёмы праспекцыі і рэтраспекцыі магчыма аб’яднаць у адзін вялікі клас адзінак на базе агульных заканамернасцей іх функцыянавання. У аснову інтэграцыі структурна-сэнсавай рэпрэзентацыі праспекцыі і рэтраспекцыі пакладзены ўніверсальныя параметры класіфікацыі: наяўнасць праспекцыі і рэтраспекцыі ў мастацкіх творах, магчымасць выражэння катэгорый моўнымі сродкамі, утварэння рода-відавога класа значэнняў праспекцыі і рэтраспекцыі ў творах У. Гніламёдава.

Відавочную навуковую навізну ўтрымліваюць палажэнні, якія вынесены на абарону. Аўтар праважерна сцвярджае, што кваліфікацыйныя прыкметы катэгорыі праспекцыі – магчымасць структурна-сэнсавай дыферэнцыяцыі і наяўнасць логіка-семантычных адносін паміж праспектыўнымі кампанентамі – дазваляюць выдзеліць у творах У. Гніламёдава рэпрэзентатыўныя тыпы катэгорыі, логіка-семантычныя адносіны паміж праспектыўнымі часткамі, маркеры праспектыўнага плана, значэнні камунікатыўнай і мадальна-сэнсавай маркіроўкі праспектыўных кампанентаў і іх структурную арганізацыю.

Навуковая навізна даследавання заключаецца ў тым, што ўпершыню ў беларускім мовазнаўстве ўстаноўлены логіка-семантычныя адносіны паміж праспектыўнымі і рэтраспектыўнымі кампанентамі; выяўлены значэнні камунікатыўнай і мадальна-сэнсавай маркіроўкі праспектыўных структур; апісаны прыёмы рэпрэзентацыі кампазіцыйна-тэкставай рэтраспекцыі з улікам колькаснага складу яе кампанентаў; вызначана структурная арганізацыя праспектыўных і рэтраспектыўных частак.

Атрыманыя вынікі даследавання, навуковыя палажэнні, якія вынесены на абарону, з’яўляюцца перспектыўнымі для распрацоўкі тэарэтычных і метадалагічных пытанняў беларускага мовазнаўства. Аргументаванасць і дакладнасць заключных вывадаў, сфармуляваных у дысертацыі, грунтуецца на комплекснай метадалогіі даследавання, на рознабаковым аналізе фактычнага матэрыялу. Дысертацыйнае даследаванне прайшло належную апрабацыю; яго матэрыялы апублікаваны ў 14 навуковых працах агульным аб’ёмам 4,66 аўтарскія аркушы. Асабіста аўтару належаць публікацыі аб’ёмам 4,66 аўт. аркушы.

Праца Дзігадзюк Валянціны Паўлаўны “Катэгорыя праспекцыі і рэтраспекцыі ў мастацкай прозе У. Гніламёдава” выконвалася ў межах навуковых тэм “Слово, образ, текст в современной парадигме знаний: лингвистический, литературоведческий и дидактический аспекты” (2016–2020 гг.); “Кагнітыўна-дыскурсіўная структура мастацкага тэксту:

семантыка-сінтаксічныя і лексіка-граматычныя асаблівасці” (2021–2025 гг.).

Афармленне дысертацыі і аўтарэферата адпавядае патрабаванням, якія прад’яўляюцца да дысертацый (аўтарэфератаў) на прысуджэнне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук.

**Канкрэтныя навуковыя вынікі (з указаннем іх навізны і практычнай значнасці), за якія саіскальніку можа быць прысуджана вучоная ступень, на якую ён прэтэндуе**

Дысертантам упершыню ўстаноўлены комплекс навуковага аналізу катэгорый праспекцыі і рэтраспекцыі ў мастацкіх творах У. Гніламёдава, абгрунтаваны падзел праспекцыі на кампазіцыйна-тэкставую, сюжэтна-кампазіцыйную і рэтраспекцыі на адсылачную, кампазіцыйна-тэкставую, тэкставую сюжэтную; выяўлены прыёмы кампзіцыйна-тэкставай рэтраспекцыі – інфармацыйнае дапаўненне, супастаўленне і параўнанне, прыём прамой актуалізацыі мінулых падзей і інш.; вызначаны маркеры праспекцыі – формы будучага часу дзеясловаў, формы дзеепрыметніка, формы загаднага і ўмоўнага ладу дзеясловаў, мадальныя дзеясловы і рэтраспекцыі – лексічны паўтор, прыслоўі часу, прыметнікі з указаннем на час, займеннікі, формы, дзеепрыметніка і інш. У дысертацыйным даследаванні прааналізавана структурная арганізацыя праспектыўных і рэтраспектыўных кампанентаў. Новым з’яўляецца выяўленне і класіфікацыя камунікатыўна і мадальна-сэнсавай маркіроўкі праспектыўных структур, вызначэнне адносін паміж праспектыўна і рэтраспектыўна абумоўленымі структурамі. Уведзены ў навуковы ўжытак новыя паняцці – тыпалогія адносін паміж праспектыўнымі і рэтраспектыўнымі кампанентамі і значэнні іх камунікатыўнай і мадальна-сэнсавай маркіроўкі.

Інавацыйны характар мае распрацаваная ў дысертацыі класіфікацыя адносін паміж праспектыўнымі і рэтраспектыўнымі кампанентамі – тоеснасці, уключэння, перасячэння, неадпаведнасці. На падставе распрацаванай тыпалогіі даследавання праспекцыі і рэтраспекцыі створана картатэка фактычнага матэрыялу, якая складае 1463 адзінкі – праспектыўныя і рэтраспектыўныя адзінкі (блокі) у раманах У. Гніламёдава. Названы моўны матэрыял цалкам адлюстраваны ў падрыхтаваных аўтарам дысертацыі дадатках.

Змест працы паказвае, што вынікі, атрыманыя аўтарам, маюць як тэарэтычную, так і практычную каштоўнасць. Тэарэтычная значнасць даследавання заключаецца ў распрацоўцы тэарэтычнай базы і сістэмы комплекснага аналізу катэгорый праспекцыі і рэтраспекцыі ў беларускім мастацкім творы.

Практычная каштоўнасць работы заключаецца ў магчымасці выкарыстоўваць вынікі дысертацыйнага даследавання, асноўныя палажэнні, сістэматызаваны і інтэрпрэтаваны фактычны матэрыял у практыцы далейшай распрацоўкі тэорыі лінгвістыкі тэксту (мастацкага, публіцыстычнага, навуковага), а таксама падчас распрацоўкі і выкладання адпаведных дысцыплін – “Беларускае мовазнаўства”, “Сучасная беларуская літаратурная мова”, “Стылістыка беларускай мовы”, “Філалагічны аналіз тэксту”, “Коммуникативная лингвистика и текстология”.

Вучоная ступень кандыдата філалагічных навук можа быць прысуджана Валянціне Паўлаўне Дзігадзюк **за:**

– распрацоўку функцыянальна-сэнсавых параметраў упарадкавання катэгорый мастацкага тэксту і вылучэнне рэпрэзентатыўных тыпаў праспекцыі (кампазіцыйна-тэкставая і сюжэтна-кампазіцыйная), логіка-семантычных адносін паміж праспектыўнымі часткамі (тоеснасці, уключэння, перасячэння, неадпаведнасці), маркераў (лексіка-граматычных, камунікатыўных, мадальна-сэнсавых) і структурнай арганізацыі праспектыўнага плану;

– выяўленне ўніверсальных асаблівасцей катэгорый праспекцыі і рэтраспекцыі ў мастацкіх творах у цэлым і іх спецыфічных асаблівасцей у раманах У. Гніламёдава ў прыватнасці; за распрацоўку параметраў тыпалогіі моўнай рэпрэзентацыі праспекцыі і рэтраспекцыі;

– даследаванне катэгорыі рэтраспекцыі ў творах У. Гніламёдава на аснове ўніверсальных і спецыфічных параметраў яе тыпалогіі і выдзяленне адпаведных тыпаў *(адсылачная, кампазіцыйна-тэкставая і тэкставая сюжэтная)*, відаў (кантактная і дыстантная) і маркераў адсылачнай рэтраспекцыі, а таксама логіка-семантычных адносін паміж рэтраспектыўнымі кампанентамі (тоеснасці, уключэння);

– распрацоўку відаў (пазатэкствая, фактычная), прыёмаў (намінацыя рэтраспектыўных падзей, інфармацыйнае дапаўненне фактаў, супастаўленне і інш.), асаблівасцей моўнага выражэння і будовы кампазіцыйна-тэкставай і тэкставай сюжэтнай рэтраспекцыі.

**Заўвагі па дысертацыі**

Даючы станоўчую ацэнку даследаванню В.П. Дзігадзюк, варта адзначыць некаторыя яго дыскусійныя моманты:

1. Згодна з азначэннем аўтара, што “Катэгорыя праспекцыі ў мастацкіх творах мае двухкампанентную структуру – яна ўключае праспектыўную і постпраспектыўную часткі, узаемадзеянне якіх у працэсе разгортвання сюжэта фарміруе адносіны – тоеснасці, уключэння, перасячэння, неадпаведнасці” (с. 41), лічым мэтазгодным ужываць тэрміны “адносіны праспекцыі” (замест “праспектыўныя адносіны”) і, адпаведна, “адносіны рэтраспекцыі” (с. 77).

2. Пры пацвярджэнні тэарэтычных палажэнняў прыкладамі дысертантам дастаткова поўна былі прадстаўлены сінтаксічныя рэпрэзентатыўныя сродкі – далучальныя канструкцыі: – *Толькі ж каб на бацькаўшчыну вярнуліся! **І Фёклу бяры з сабой.** Бласлаўляю вас...* («Расія», с. 585). <...> [*Для некаторых прускаўцаў тое, што **Лявон браў з сабою Фёклу**, аказалася нечаканым*] («Расія», с. 597) (ст. 65); кантэкстуальныя няпоўныя сказы: – ***Абмундзіраванне калі дадуць?*** – *спытаў нехта са старaслужачых.* – ***У следующчы раз,*** – *паабяцаў каптэнармус* («Расія», с. 251). <...> [*Таццянка аціх і не рады быў таму, што падаў голас.* – ***Ногі, рукі, твары паабмарожвалі, не маючы*** *па панятных прычынах* ***патрэбнага абмундзіравання***] («Расія», с. 472) (ст. 64, 65, 86 і інш.). Пры гэтым хацелася б больш дэталёвага тлумачэння сутнасці названых з’яў і іх размежавання з сумежнымі паняццямі – сегментацыяй і адчляненнем, пра якія варта было б згадаць у дысертацыі.

3. Не зусім зразумела, па якіх крытэрыях да пэўных тыпаў складаных сказаў адносяцца наступныя прыклады: да складанага сказа камбінаванай будовы: *Па Прусцы ўжо гайсалі казакі, размахвалі нагайкамі, прыспешвалі. Прайшоў слух,* ***што будуць узрываць крухмальню*** *і што ўжо* ***прыехалі сапёры, якія павінны гэта зрабіць*** («Расія», с. 90) (с. 46); да бяззлучнікавага: <...> – *Была ў нас падзея:* ***Фядору з Варкай замуж выдалі,*** *і, здаецца, за добрых хлопцаў* («Вяртанне», с. 135) (с. 81); да складаназалежнага сказа з рознымі дадатнымі часткамі: [– *Баяліся разрастання нашай справы. Ну, словам,* ***апынуўся я (Кляновік) у турме. І ў Чыкага сядзеў, і ў Аклахоме быў, і ў Каліфорніі***] («Расія», с. 622) (с. 85)?

4. Валянціна Паўлаўна ў дысертацыйным даследаванні адзначае, што “Маркерамі праспектыўнай структуры выступаюць формы будучага часу і розныя лексіка-граматычныя адзінкі – формы дзеепрыметнікаў, формы ўмоўнага і загаднага ладу, мадальныя дзеясловы, акалічнасці часу, выражаныя прыслоўямі часу і назоўнікамі з прыназоўнікамі; складаназалежныя сказы розных відаў, пытальныя сказы, эліптычныя і рэдукаваныя канструкцыі, канструкцыі з імпліцытнай семантыкай і сінтаксічнай непаўнатой, далучальныя канструкцыі, устаўныя канструкцыі, пытальна-адказныя комплексы” (ст. 68). Пры гэтым не зусім зразумела, чаму сінтаксічныя канструкцыі адносяцца да лексіка-граматычных адзінак?

5. Таксама патрабуе тлумачэнне палажэнне, што “Адносіны рэтраспектыўнай тоеснасці фарміруюцца часам на аснове ўзаемадзеяння лексем з рознымі граматычнымі формамі – назоўнікам і дзеясловам *разгон* і *разагналі:* [*Да Запалоннага закаціўся* ***слухпра разгон Устаноўчага сходу****, які, як аказалася, разыйшоўся з савецкай уладай і ў першай палавіне студзеня быў распушчаны*] («Расія», с. 366). <...> *20 студзеня.* ***Разагналі Учрадзіцельны сход.*** *Правільна!* («Расія», с. 371). Ці варта адносіць назоўнік *разгон* і дзеяслоў *разагналі* да “лексем з рознымі граматычнымі формамі” (с. 79)? Ці ўсё ж гэта розныя лексіка-граматычныя класы слоў з тоеснай семантыкай?

Выказаныя крытычныя заўвагі скіраваны на ўдакладненне пэўных пазіцый і падыходаў аўтара дысертацыі і не зніжаюць агульную высокую ацэнку даследавання.

**Адпаведнасць навуковай кваліфікацыі саіскальніка вучонай ступені, на якую ён прэтэндуе**

Прадстаўленае дысертацыйнае даследаванне Дзігадзюк Валянціны Паўлаўны “Катэгорыя праспекцыі і рэтраспекцыі ў мастацкай прозе У. Гніламёдава” ўяўляе сабою самастойна выкананую кваліфікацыйную работу. Адпаведнасць навуковай кваліфікацыі пацвярджаецца ўменнем акрэсліваць і паглыблена разгортваць тэарэтычныя палажэнні, здольнасцю самастойна аналізаваць разнастайны па змесце і форме фактычны матэрыял. Выкананы ў працы глыбокі аналітычны агляд лінгвістычнай літаратуры (усяго ў бібліяграфіі 198 пазіцый), сістэматызацыя і абагульненне розных пунктаў погляду дэманструюць належную філалагічную падрыхтоўку саіскальніка. Работа напісана з выкананнем усіх патрабаванняў да навуковага выкладу, вылучаецца

выразнасцю стылю. Вынікі даследавання поўна адлюстраваны ў навуковых публікацыях аўтара, з якіх 7 – артыкулы ў выданнях са спіса ВАК.

Выкарыстаныя метады, аб’ём і якасць фактычнага матэрыялу, яго навуковае апісанне і атрыманыя вынікі сведчаць пра тое, што саіскальнік В.П. Дзігадзюк мае навуковую кваліфікацыю, якая адпавядае вучонай ступені кандыдата філалагічных навук.

**Заключэнне**

Дысертацыйнае даследаванне Дзігадзюк Валянціны Паўлаўны “Катэгорыя праспекцыі і рэтраспекцыі ў мастацкай прозе У. Гніламёдава” (навуковы кіраўнік – доктар філалагічных навук, прафесар Н.У. Чайка) з’яўляецца кваліфікацыйнай навуковай працай, якая адпавядае п. 19 і п. 20 Палажэння аб прысуджэнні вучоных ступеняў і прысваенні вучоных званняў у Рэспубліцы Беларусь.

Водзыў аб дысертацыі “Катэгорыя праспекцыі і рэтраспекцыі ў мастацкай прозе У. Гніламёдава”, прадстаўленай Дзігадзюк Валянцінай Паўлаўнай, у адпаведнасці з загадам рэктара ўстановы адукацыі “Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С.Пушкіна” ад 25.09.2023 года № 643, разгледжаны і абмеркаваны на навуковым сходзе – пасяджэнні кафедры беларускай філалогіі ўстановы адукацыі “Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С.Пушкіна” 27 верасня 2023 года (пратакол № 3). Саіскальнік В.П. Дзігадзюк выступіла з дакладам па дысертацыі на пасяджэнні навуковага сходу і адказала на зададзеныя пытанні.

Вынікі галасавання: “за” – 10; “супраць” – няма; “устрымаліся” – няма.

Старшыня пасяджэння –
загадчык кафедры беларускай філалогіі
ўстановы адукацыі “Брэсцкі дзяржаўны
ўніверсітэт імя А.С.Пушкіна”,
кандыдат філалагічных навук, дацэнт Н.Р.Якубук

Сакратар пасяджэння –
дацэнт кафедры беларускай філалогіі
ўстановы адукацыі “Брэсцкі дзяржаўны
ўніверсітэт імя А.С.Пушкіна”,
кандыдат філалагічных навук, дацэнт Т.А.Кісель

Эксперт –
дацэнт кафедры беларускай філалогіі
ўстановы адукацыі “Брэсцкі дзяржаўны
ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна”,
кандыдат філалагічных навук, дацэнт Л.В.Леванцэвіч

Установа адукацыі «Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна»
АДДЗЕЛ КАДРАЎ
Подпіс ............ пацвярджаю
Нач. АК БрДУ ............